# *§ 48–0. Развіццё навуковых ведаў і адукацыі ў Беларусі

**1. Праваслаўныя брацтвы.** Брацтвы як украінскія і беларускія нацыянальна-рэлігійныя грамадскія арганізацыі існавалі ў XVI–XVIII стст. Аднак у шэрагу крыніц першыя праваслаўныя брацтвы на тэрыторыі Беларусі згадваюцца з XII ст.

Магдэбургскае права і гарадскія вольнасці, што яму папярэднічалі, дазволілі сфарміравацца на сярэдневяковых беларускіх землях новаму саслоўю — мяшчанам. У XVI ст. мяшчане ўсведамляюць сябе як асобнае саслоўе ў дзяржаве.

Ішоў працэс фарміравання самасвядомасці беларускага народа, перш за ўсё дэмакратычных пластоў грамадства. Канкрэтнымі яго праявамі выступалі любоў да Радзімы, зацікаўленае стаўленне да яе мінуўшчыны, цяперашчыны і будучыні, клопат пра развіццё роднай культуры і яе захаванне перад пагрозай паланізацыі.

Беларускія і ўкраінскія гараджане стваралі своеасаблівыя апякунскія арганізацыі, што ўсталёўвалі патранат над мясцовай царквой. Брацтвы як добраахвотныя царкоўныя аб’яднанні гараджан выраслі з гарадской цэхавай структуры, якая, нягледзячы на сваю ўмоўную закрытасць, прадугледжвала простыя і рэальныя для выканання правілы ўваходжання ў карпарацыі, у адрозненне ад закрытага шляхецкага саслоўя. Як і рамесныя цэхі, брацтвы мелі статуты, зацверджаныя царкоўнымі і свецкімі ўладамі; яны карысталіся перавагамі гарадскога самакіравання, што існавалі ў гэты перыяд. Узнікненне падобных арганізацый выражала імкненне гараджан пашырыць свой уплыў не толькі на рэлігійна-

царкоўныя справы, але і на грамадска-палітычнае жыццё, адукацыю, культуру ў цэлым.

Палітыка дзяржаўнай улады, якая стала на бок каталіцтва і пачала гвалтам прымушаць праціўнікаў уніі падпарадкавацца ўладзе біскупаў-уніятаў, выклікала незадаволенасць ва ўсіх пластах «рускага» грамадства. У XVII ст. брацтвы ператварыліся ў досыць масавыя арганізацыі, у якіх разам з гараджанамі ўдзельнічалі патрыятычна настроеныя духавенства і шляхта. Брацтвы існавалі ў Брэсце, Вільні, Кіеве, Віцебску, Мінску, Магілёве і іншых гарадах Вялікага Княства Літоўскага.

Пры брацтвах засноўваліся школы, тыпаграфіі, шпіталі. Крызіс праваслаўнай царквы, аднаўленне перамоў наконт уніі з Рымам, пашырэнне рэфармацыйных вучэнняў таксама стымулявалі дзейнасць праваслаўных брацтваў. Асабліва важным быў перыяд ад заключэння уніі ў Брэсце (1596 г.) да аднаўлення праваслаўнай іерархіі ў Рэчы Паспалітай у 30-я гг. XVII ст. У гэты час праваслаўныя брацтвы ўцягваліся ў літаратурную палеміку, адпраўлялі сваіх прадстаўнікоў на соймы, кіравалі ўсімі галінамі жыцця праваслаўнага грамадства, паколькі праваслаўная іерархія зрабілася незаконнай.

У брацкім асяродку фарміраваўся светапогляд прагрэсіўных грамадскіх і культурных дзеячаў, з яе выйшлі рэктары і настаўнікі школ, выдаўцы падручнікаў і палітычных антыўніяцкіх трактатаў, папулярных рэлігійна-філасофскіх сачыненняў; такім чынам складваўся пласт прагрэсіўна настроенай беларускай і ўкраінскай інтэлігенцыі.

Дзейнасць брацтваў была адлюстраваннем працэсу станаўлення саслоўяў у ВКЛ. Калі функцыі і арганізацыі саслоўяў аформіліся і юрыдычна, і фактычна, існаванне праваслаўных брацтваў як органаў самакіравання, іх асаблівыя паўнамоцтвы

ператварыліся ў перашкоду для афіцыйнай праваслаўнай іерархіі і дзяржаўнай улады.

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

У брацкіх школах можна было атрымаць пачатковую і сярэднюю адукацыю. У аснове іх дзейнасці ляжаў статут, які прымала брацтва. Да нашага часу захаваўся Статут Луцкай брацкай школы.

**Статут школы Луцкага брацтва (1624 г.)**

**Артыкул 1.** …Настаўнік гэтай школы мусіць быць пабожны, разважлівы, ціхмяны, рахманы, устрымлівы, не п'яніца, не распуснік, не ліхвяр, не гняўлівы, не зайздроснік, не смехатворца, не брыдкаслоў, не чарадзей, не байкаплёт, не ерэтык, але спаспешнік пабожнасці, ва ўсім уяўляючы сабою ўзор добрых дзей. У такіх цнотах няхай будуць і вучні, як іх настаўнік.

**Артыкул 4.** Багатыя перад убогімі ў школе нічым не могуць быць вышэйшыя, як толькі навукаю; а з выгляду роўныя ўсе…

**Артыкул 5.** Настаўнік мае і вучыць і любіць дзяцей усіх аднолькава, як сыноў багатых, так і сіротаў убогіх, і тых, якія ходзяць вуліцамі, просячы на пражытак. Вучыць іх, колькі хто сіл навучыцца мае, адно не дбайней пра адных, чым пра іншых…

**Артыкул 6.** Сыходзіцца ў школу хлопчыкі маюць у пэўны час, г. зн. у большыя дні каб усе былі а 9-й гадзіне; гэтаксама і ў меншыя дні, як установіць настаўнік. І адпускаць іх пасля вучэння дадому таксама ў прызначаны час…

**Артыкул 9.** Дзеці ў школе маюць быць падзелены натрое: адныя, што будуць вучыцца пазнаваць літары і складаць; другія, што будуць вучыцца чытаць і вучыць на памяць розныя ўрокі; трэція будуць прывучацца тлумачыць прачытанае, разважаць і разумець.

*1. Як было арганізавана навучанне ў брацкіх школах?*
*2. Якія патрабаванні да настаўніка і вучняў прапісаны ў Статуце?*
*3. Параўнайце патрабаванні да настаўніка са Статута брацкай школы з Правіламі педагагічных работнікаў Рэспублікі Беларусь.*

**2. Езуіцкія калегіумы ў Беларусі.** Езуіцкія калегіумы з’явіліся ў Беларусі ў другой палове XVI ст. Іх слава была настолькі вялікая, што ў іх аддавала сваіх дзяцей знаць з Варшавы і Вільні, Пецярбурга і Масквы. Сябры ордэна «Таварыства Ісуса» — езуіты — добра разумелі, што будучыня залежыць ад

моладзі, і разглядалі адукацыю як найважнейшы сродак дасягнення сваіх мэт. Таму яны стараліся прывабіць у свае навучальныя ўстановы як мага большую колькасць дзяцей і юнацтва, імкнучыся манапалізаваць адукацыю ў сваіх руках. У школы прымаліся дзеці ўсіх веравызнанняў, у тым ліку праваслаўныя і пратэстанты. Напрыканцы навучання яны ператвараліся ў каталікоў. З цягам часу большасць вучняў калегіумаў пачалі складаць выхадцы са шляхты, якія сяліліся побач з вучэбнымі карпусамі ў інтэрнатах. Педагогі ўмелі выхоўваць са сваіх гадаванцаў сапраўдных абаронцаў рымска-каталіцкай царквы, прычым дзейнічалі не прымусам, а перакананнем. Езуіты былі праваднікамі не толькі веравучэння рымска-каталіцкай царквы, але і польскай мовы і культуры. Такім чынам, навучальныя ўстановы ордэна спрыялі паланізацыі насельніцтва.

Навучанне ў калегіумах было заснаванае на прынцыпах класна-ўрочнай сістэмы і паэтапнага асваення вучэбнага матэрыялу. Вучні рэгулярна паўтаралі змест пройдзеных урокаў, вялікае месца ў адукацыйным працэсе займала самастойная работа. Шырока выкарыстоўваліся такія формы вучэбнай актыўнасці, як дыспуты і напісанне сачыненняў.



*Партрэт Мацея Казіміра Сарбеўскага. XVII ст.*

Асаблівае значэнне надавалася правядзенню дыспутаў, якія выступалі магутным інструментам умацавання пазіцый каталіцкага вучэння сярод моладзі. Мастацтву вядзення палемікі асаблівую ўвагу надаваў выбітны дзеяч эпохі Адраджэння Мацей Казімір Сарбеўскі, чые ідэі развівалі вучні, у тым ліку Мікалай Кміціц і Жыгімонт Лаўксмін.

Езуіты першыя ў Сярэднявеччы пачалі падрыхтоўку кваліфікаваных выкладчыкаў шляхам арганізацыі спецыяльных навучальных устаноў — настаў-

ніцкіх семінарый, якія размяшчаліся звычайна пры найбуйнейшых калегіумах. Гэта дазволіла забяспечыць высокі ўзровень падрыхтоўкі кадраў, якія мелі ўсе неабходныя веды і ўменні для эфектыўнага выкладання розных дысцыплін.

У калегіумах існавала дэтальна распрацаваная сістэма заахвочванняў (ганаровыя месцы ў класе і іншыя знакі ўзнагароды) і пакаранняў (ганебныя лавы, каўпакі з аслінымі вушамі і інш.). У езуіцкіх школах практыкавалася арганізацыя спаборніцтваў паміж класамі; кожны вучань ведаў, што ад яго поспехаў у вучобе залежыць поспех усёй каманды. Вучні незалежна ад паходжання і ступені знатнасці даглядалі бедных і хворых у шпіталях, апекавалі ўбогіх, наведвалі турмы, па меры сіл дапамагаючы зняволеным, выкладалі малодшым катэхізіс і інш. Падобныя акцыі будзілі ў маладых сэрцах спагаду да чужога гора, імкненне дапамагчы незнаёмаму чалавеку, які трапіў у бяду, вучылі міласэрнаму стаўленню да малодшых. Асноўнымі дысцыплінамі былі грэчаская і лацінская мовы, але ў старэйшых класах уводзіліся рыторыка, міфалогія, геаграфія, антычная гісторыя. Вучні асвойвалі аратарскае майстэрства, мастацтва напісання лістоў, распрацоўвалі навыкі вядзення гутарак — вітальных і развітальных, публічных і прыватных. Настаўнікі ордэна ўмелі знаходзіць таленты і развіваць іх. Вынікам гэтай мэтаскіраванай дзейнасці было тое, што ў згаданы перыяд з езуіцкіх школ Беларусі выйшла нямала таленавітых людзей, якія ўзбагацілі еўрапейскую культуру (Ігнацій Жаба, Міхал Карыцкі, Марцін Пачобут-Адляніцкі і інш.).

Пры калегіумах фарміраваліся ёмістыя бібліятэкі. Так, бібліятэка Полацкага калегіума налічвала, паводле розных ацэнак, ад 52 да 147 тыс. асобнікаў.



*Партрэт Марціна Пачобут-Адляніцкага. 1820 г.*

Звычайна адкрыццё езуіцкіх калегіумаў было працягам місіянерскай дзейнасці сябраў ордэна «Таварыства Ісуса». Пасля Нясвіжа і Гродна езуіты атабарыліся ў памежнай з Расіяй Оршы, у Мсціславе, пасля ў Навагрудку, Брэсце, Пінску, Віцебску. Так, езуіты ў Мсціславе пачалі сваю дзейнасць у 1616 г. як місія. У 1691 г. пры місіі была адкрыта ніжэйшая школа, у сярэдзіне XVIII ст. тут выкладаліся філасофія, тэалогія, матэматыка, гісторыя; у 1779 г. школа пераўтворана ў калегіум. Мсціслаўскі калегіум быў адным з найбуйнейшых ва Усходняй Беларусі.

У 1773 г. Папа Рымскі Клімент XIV забараніў дзейнасць езуітаў у Рыме. Застаўшыся без галоўнай рэзідэнцыі, ордэн абраў у якасці новай сталіцы Полацк, дзе ад 1581 г. дзейнічаў езуіцкі калегіум. У Полацк, Віцебск, Оршу, Магілёў і Мсціслаў пачалі прыязджаць выбітныя прадстаўнікі ордэна, якія да таго часу працавалі ў іншых краінах. Была нават прапанаваная новая назва ордэна — «Таварыства Ісуса ў Беларусі» («Societatis Jesu in Alba Russia»). Так Усходняя Беларусь уратавала інтэлектуальную



*Рыначная плошча. Касцёл Святога Стэфана і калегіум езуітаў. Г. Полацк. 1864 г.*

эліту ордэна езуітаў. У Полацкім калегіуме разам з іншымі ў 1784 г. пачаў працаваць выбітны вучоны Габрыэль Грубер. Ён скончыў Венскі ўніверсітэт, дзе атрымаў званне доктара. Грубер выкладаў механіку і архітэктуру, эксперыментальную фізіку.

«Таварыства Ісуса» будавала трывалыя школьныя будынкі, разлічаныя на шмат дзесяцігоддзяў. Яны мелі прасторныя класныя памяшканні і калідоры з вялікімі вокнамі, якія пры халодным надвор'і і ўзімку добра ацяпляліся. Паўстагоддзя з 1773 г. да 1820 г. ахапіла станаўленне архітэктурнага ансамбля Полацкага калегіума; ён робіцца галоўнай архітэктурнай дамінантай горада. У Полацкім езуіцкім калегіуме ў 1802 г. функцыянавалі два факультэты: грамадзянскай і ваеннай архітэктуры, дзе навучалася 40 чалавек.

Пінскі калегіум езуітаў 1630-х гг. быў у свой час самай вялікай і магутнай каменнай пабудовай у краіне.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*1. Растлумачце прычыны з'яўлення езуіцкіх калегіумаў у ВКЛ у XVI–XVII стст.*

*2. Параўнайце вучобу ў навучальных установах XVI–XVII стст., пашыраных на тэрыторыі Беларусі. Вызначце агульныя і адметныя рысы. Афарміце іх у выглядзе табліцы.*



*Езуіцкі калегіум. Г. Пінск. Брэсцкая вобласць. Сучасны выгляд*



*Комплекс былога езуіцкага калегіума. Г. Орша. Магілёўская вобласць. Сучасны выгляд*

Да нашага часу дайшлі далёка не ўсе збудаванні езуітаў. Будынкам, які захаваўся з сярэдзіны XVII ст., з'яўляецца езуіцкі касцёл у Гродна, на прыкладзе якога можна бачыць змены, што адбыліся ў архітэктуры ад часу ўзвядзення першага барочнага касцёла ў Нясвіжы.

**3. Выхадцы з Беларусі ў еўрапейскіх універсітэтах.** Пашырэнне ідэй Адраджэння і Рэфармацыі, адсутнасць універсітэта на тэрыторыі ВКЛ паспрыялі імкненню моладзі атрымаць адукацыю за межамі княства. Традыцыя адпраўкі дзяцей з сем'яў арыстакратаў Вялікага Княства Літоўскага для атрымання ўніверсітэцкай адукацыі ў іншыя еўрапейскія краіны нарадзілася ў XV ст. і набыла папулярнасць у XVI — першай палове XVII ст.

Магчымасць атрымаць адукацыю мелі пераважна шляхта і магнаты. З гэтага правіла, вядома, былі і выключэнні. Пасля навучання ў Кракаўскім універсітэце купецкі сын Францыск Скарына атрымаў ступень «доктара медыцыны і медыцынскіх навук» у Падуанскім універсітэце. У пачатку XVI ст., да пашырэння пратэстантызму, моладзь ехала ў Італію, Францыю або бліжэйшыя ўніверсітэты — Кракаў і Прагу. Той факт, што праваслаўныя атрымоўвалі адукацыю і за межамі краіны, пацвярджаецца таксама прыкладам Льва Сапегі, што навучаўся ў Лейпцыгскім універсітэце. З пашырэннем пратэстантызму юнакі з Вялікага Княства Літоўскага накіроўваліся вучыцца ў Швейцарыю, Нідэрланды і нямецкія ўніверсітэты. Сымон Будны, вядомы дзеяч рэфармацыйнага руху ў Рэчы Паспалітай, скончыў Кракаўскі і Базельскі ўніверсітэты. У 1544–1547 гг. Андрэй Волан, вядомы дзеяч Рэфармацыі, вывучаў дыялектыку і рыторыку ва ўніверсітэце Франкфурта-на-Одэры (пасля вучыўся ў Кёнігсбергу). Жаданне мець некалькі

ўніверсітэцкіх дыпломаў сведчыла пра высокі прэстыж адукацыі.

Для шляхты, якая імкнулася пашырыць магчымасці кар’ернага росту, атрыманне грунтоўнай адукацыі адыгрывала значную ролю. Адукацыю ж магнацкіх сыноў часцяком вызначалі яны самі або іх бацькі: яны наведвалі толькі пэўныя лекцыі, бралі прыватныя ўрокі і засяроджваліся на вывучэнні замежных моў і набыцці ваеннага досведу.

З цягам часу сярод дзяцей магнатаў ВКЛ сталі папулярнымі адукацыйныя падарожжы. Яны мелі пазнавальны характар; маладыя людзі аглядалі славутасці, наведвалі ўніверсітэцкія лекцыі і знаёміліся з мясцовымі арыстакратамі. Найбольшую колькасць звестак пра такія паездкі захавалі прадстаўнікі роду Радзівілаў. Так, Януш Радзівіл (1579–1620 гг.) вывучаў этыку, палітыку і гісторыю ў Страсбургу; пасля наведаў Лейпцыг, Дрэздэн, шэраг іншых гарадоў і зноў вярнуўся ў Страсбург. Юрый Радзівіл (1556–1600 гг.) у 1570-я гг. вучыўся ў Лейпцыгу і Рыме, падарожнічаў па Італіі, Іспаніі, Францыі. Пры гэтым далёка не ўсе дзеці арыстакраты атрымоўвалі завершаную ўніверсітэцкую адукацыю або абаранялі дысертацыі. Апроч таго, нават многія магнаты не мелі грошай на такія паездкі, часцяком ім даводзілася абмяжоўваць свае запыты.



*Партрэт Януша Радзівіла. Мастак Барталамей Штробель. 1634 г.*

Заснаванне ў канцы XVI ст. Віленскай езуіцкай акадэміі адкрыла перспектывы атрымання ўніверсітэцкай адукацыі для менш багатых людзей. Тут вучыліся Жыгімонт Лаўксмін, Альберт Каяловіч. У акадэміі выкладалі вядомыя прафесары ВКЛ, якія атрымалі вышэйшую адукацыю ў іншых еўрапейскіх універсітэтах. Некаторыя выпускнікі акадэміі былі рэкамендаваныя ў іншыя еўрапейскія ўніверсітэты для далейшага навучання.

1. Якія змены адбыліся ў сістэме адукацыі ВКЛ у другой палове XVI ст.?
2. Вызначце асноўныя прычыны імкнення моладзі з ВКЛ атрымліваць адукацыю за межамі княства.
3. Якія сацыяльныя групы валодалі найбольшымі магчымасцямі для атрымання адукацыі за межамі сваёй краіны?